№ 225 (347)
Серада, 17 снежня 1997 г.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...


Якуб Колас



Сонца

	Усход	Захад
Мінск	8.23	15.48
Гомель	8.01	15.43
Гродна	8.37	16.05
Магілёў	8.12	15.38
Віцебск	8.21	15.31
Брэст	8.29	16.14

Апошняя квадра 21 снежня



Зімовая казка.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БелТА.

Постскриптум

Николай Зенько доказал, что он человек, а не раб

Валерий АЛЕКСЕЕВ

Как уже писалось, безработный Николай Зенько в знак протеста против закрытия выписываемой им газеты "Свабода", незаконного ареста и содержания за решеткой А.Шидловского, В.Лобковича, В.Кабанчука провел по месту жительства, в Ганцевичах, голодовку в защиту оппозиционного издания и узников совести. Я же сегодня хочу подробнее рассказать, как развивались события и чем все закончилось.

Вряд ли советники президента, предложившие прикрыть столь вредное для "вертикали" издание, как газета "Свабода", предполагали, что протест перешагнет за дорожное кольцо столицы. Недооценили лукашенковские спецы собственный народ. Просчитались купленные социологи "вертикали", ведь толерантность белорусов вовсе не синоним их покорности "пану". Зато полностью покорна "хозяину" вся президентская рать. Ганцевичская "вертикаль" действовала по той же "технологии", что и столичная.

Николай Михайлович объявил голодовку 27 ноября т.г. Информацию об этом, в форме соответствующего заявления, лично отнес главврачу ганцевичской больницы и председателю районного Совета депутатов. Однако избранник народа Семашонок Иван Иванович не считает себя главным защитником избирателей района, поэтому с издевкой предложил местному защитнику прав человека ехать голодать в... Столбцы.

Николай Зенько задал сему руководителю вполне закономерный вопрос: "Почему в "Советской Белоруссии" можно было требовать от президента Соединенных Штатов — "Свободу Анджеле Дэвис", а от президента Чили — "Свободу Луису Карвалану", но нельзя в Ганцевичах требовать свободы единомышленникам, томящимся в застенках СИЗО?" Ответ был такой: "Объявляй голодовку у себя в огороде".

Не получив путного ответа от властей на свое обращение, Николай Михайлович, повесив на грудь и спину плакаты с информацией о голодовке и ее целях, стал прохаживаться по центральной площади райцентра. Такими действиями он не нарушал ни законов Республики Беларусь, ни подзаконных актов. Тем не менее местная милиция схватила Н.Зенько, запихала в "воронок", привезла в райотдел, составила протокол об административном правонарушении и доставила в районный суд.

Судья А.С.Космач назначил слушание дела на следующий день и отпустил голодающего. Николай Зенько, вполне закономерно посчитав, что проводить политическую акцию в огороде смысла не имеет, в ожидании суда продолжил ее на площади. Однако милиция вновь, правда, на этот раз уже по распоряжению из Бреста, схватила голодающего и без каких-либо оснований продержала его до суда.

Подсудимый Н.Зенько потребовал у суда адвоката, допуска, в соответствии с Конституцией, на процесс родственников и товарищей, а также проведения судебного исследования в зале заседаний. Адвоката, правда, дали, но судебное разбирательство провели в кабинете судьи, на которое допустили лишь жену обвиняемого.

Надо отдать должное адвокату Людмиле Владимировне Халецкой, неопровержимо доказавшей суду, что виновным является председатель Совета, который не зарегистрировал должным образом поступившее заявление, не предпринял никаких мер по его рассмотрению, не разъяснил заявителю его права и обязанности. Но белорусская Фемида, как известно, ни подсудимых, ни их адвокатов не слышит, и судья А.Космач за протест против действия властей объявил голодающему десять суток ареста.

Издевательства над политзаключенным продолжались и в камере. Иначе как садистскими не назовешь действия надзирателей, которые заставляли остальных арестованных принимать пищу не в столовой, а в камере, в присутствии голодающего Николая Зенько. Но узник совести не сдался.

Николай Михайлович Зенько прекратил голодовку лишь после выхода из тюрьмы 8 декабря 1997 года и то по личной просьбе единомышленников. Побольше бы

Незлобивые заметки

Семен БУКЧИН

Если свободы слова нет нигде, то почему она должна быть в Беларуси?

"Здравые рассуждения" генерала Лебедя



У Александра Ивановича Лебедя ум, как известно, крепкий, что называется, непрошибаемый. Скажет как припечатает. Хочешь возразить и чувствуешь: а сказать-то нечего, и язык липнет к гортани.

Недавно Александр Иванович дал интервью одной из крупнейших польских газет "Rzeczypospolitej". Корреспондент спрашивает: "Какие личные выводы для себя вы сделали из афганской кампании?" Отставной генерал четко рубит: "Нечего добиваться того, что тебе не принадлежит и никогда принадлежать не будет". Получив такой ответ, корреспондент делает неожиданный поворот: "Но сейчас России как будто нужна Беларусь?"

"А зачем России Беларусь? — отвечает Лебедь. — Есть два суверенных государства. Есть два народа, ведущие свою историю от одного корня, имеющие по сути один язык, одну историю, одну культуру, одинаковые военные традиции. Поэтому и нужно строить цивилизованные отношения между ними, между братскими народами".

Польский журналист — человек деликатный. И он не спросил генерала: если один язык, одна история, одна культура, то на чем, собственно, основывается белорусская государственность, белорусская суверенность? Полагаю, Александр Иванович и тут не растерялся бы. Поискал бы какие-нибудь примеры в мировой истории. В конце концов, и суверенность-то бывает разная. Есть, к примеру, западная. А есть наша, родимая, "однокорневая", особая, с этническим подмесом. Западу, конечно, этого не понять...

Видимо, ощущая эту непостижимость логики генерала, журналист пошел напрямую: "Является ли демократом президент Лукашенко?"

Да, несомненно, развратились поляки за несколько лет независимости. Они думают, что Лебедя можно "убить" такими лобовыми вопросами. И, естественно, сами получают в лоб: "Президент Лукашенко был избран белорусским народом. После этого, насколько мне известно, наступила консолидация белорусского народа вокруг президента, нравится это кому-то или нет".

Но наивный поляк еще пытается бороться: "Но на Беларуси нет, к примеру, свободы слова".

Нашел чем удивить генерала Лебедя! Попробуй-ка сам ответить на встречный генеральский вопрос: "А где она есть?" Эта самая свобода слова, разумеется.

Бедный журналист все еще барахтается: "Ну как же... В Польше... В России..."

Самолюбие поляков генерал решил пощадить: "В Польше не знаю, а в России никакой свободы слова нет". И пояснил на конкретном примере: "В России были две газеты — "Комсомольская правда" и "Известия". Обе куплены на корню, обоих редакторов убрали, реформировали целиком редакции, и на этом свобода прессы кончилась. Это политика двойных стандартов. О Лукашенко все говорят, а о России молчат. А там то же самое, может, только еще круче завернуто".

Корреспондент цепляется за последнее: "Но в России нет цензуры".

И терпит окончательное поражение: "А зачем цензура? Вы можете писать, что хотите. Вас просто не будут печатать".

Глядя, как ежедневно Александр Иванович вещает по самым разным российским телеканалам, как-то затруднительно представить его в очереди к "средству информации". С протянутой рукой или тем более с заткнутым ртом.

Но главное — это, конечно же, его мужественный протест против "политики двойных стандартов". Нет свободы слова ни в Беларуси, ни в России, а может, и в целом мире... Так за что же долбают только одного президента Лукашенко?

Может, она и не нужна, эта чертова свобода слова? Много ли пользы от нее? Народ разболтался... Нет, генерал Лебедь ничего подобного в том самом интервью польской газете не говорил. Но общая тональность была весьма близка к этим мыслям. Ну нет, нет свободы слова в мире! Поэтому оставьте Беларусь в покое! И президент там избран большинством народа. Следовательно, не нужна этому народу никакая свобода слова, поскольку он, народ, думает так же, как и его президент.

Логика железная. И журналист, устав от бесполезных наскоков на генерала, в конце беседы с тоской спрашивает: "В чем, по вашему мнению, причина вашей популярности в России?"

И получает ответ, свидетельствующий, что ежели Александр Иванович отчего-то и умрет, то, безусловно, не от скромности: "Подозреваю, что немалое число людей начало читать Библию, а там сказано: не по словам, а по делам судите их. Вот и меня оценивают по поступкам".

Но слово — тоже дело, г-н генерал! Поэтому есть смысл прислушаться и к другому библейскому выражению: "Несть спасения во многоглаголании". В переводе на любимый вами солдатский язык: лишнего не болтай!

Рисунок Януша Маука-Маевского ("Rzeczpospolita").

Чытач — газета

Гэта будзе канкрэтны ўклад у падтрымку дэмакратыі

Звяртаюся да сталых падпісчыкаў "Народнай волі" з прапановай стаць актыўнымі памочнікамі ў падпісцы на шаноўнае выданне. Як гэта зрабіць?

У першую чаргу Вы павінны падпісаць сваіх бацькоў, сваякоў, знаёмых. Трэба зламаць інертнасць людзей, бо яны па звычцы выпісваюць толькі дзяржаўныя газеты.

Ёсць і яшчэ прапанова. На пошце Вы захопліваеце шмат абанементных бланкаў, запаўняеце іх і прапануеце суседзям, знаёмым. Калі нават кожны пяты пагодзіцца і Вы, узяўшы грошы, сходзіце на пошту і аплаціце, а затым аддадзіце падпісчыкам квіток, то зробіце карысную справу. Хопіць быць пасіўнымі. Гэта і будзе Ваш канкрэтны ўклад у падтрымку дэмакратыі.

Алесь ГАХОЛЬСКІ, фельчар.

Дзе сустрэне Новы год Павел Шарамет — у турме ці на свабодзе?



Сёння ў Ашмянах пачынаецца суд па сумнавядомай справе кіраўніка беларускага бюро Грамадскага расійскага тэлебачання Паўла Шарамета.

Калектыў рэдакцыі газеты "Народная воля" вылучыў на гэты працэс у якасці грамадскага абаронцы першага намесніка галоўнага рэдактара Віктара Свірко.

Заклік

Дэмакратычную прэсу — у кожны дом

Нядаўна я як сталы падпісчык "Свабоды" атрымаў па пошце паперку з прапановай забраць грошы за той тэрмін, які газета не выходзіла пасля яе раптоўнага закрыцця. Такім чынам, беларускай мове нанесены яшчэ адзін моцны ўдар, бо больш за палову матэрыялаў у "Свабодзе" друкавалася пабеларуску. Аднак мы не павінны здавацца і я прапаную падпісчыкам "Свабоды" за вернутыя грошы адразу падпісацца на іншыя дэмакратычныя выданні.

Рэспубліканская Рада ТБМ заклікае з мэтай падтрымкі беларускага друкаванага слова звярнуць увагу ў першую чаргу на газеты "Наша слова", "Пагоня", "Наша ніва", часопіс "Спадчына", а таксама на двухмоўныя газеты — **"Народная воля"**, "Беларуская маладзёжная" і іншыя незалежныя выданні, якія не карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай, але тым не меней не здраджваюць роднай мове.

Адкажам на закрыццё "Свабоды" масавай падпіскай на іншыя дэмакратычныя выданні!

Алег ТРУСАЎ, першы намеснік старшыні рэспубліканскай Рады ТБМ.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!
Да заканчэння падпіскі — 2 дні. Не спазніцеся!

Модерн в классическом стиле

Заметки с X Витебского фестиваля современной хореографии

Десять лет назад, поздней осенью восемьдесят седьмого, группа поклонников бурно развивавшихся новаторских веяний в искусстве танца из витебского ДК бытовиков пошла на смелый по меркам того времени шаг, организовав на сцене ДК фестиваль современного молодежного танца. Приехали тогда в Витебск немногочисленные коллективы с близлежащих городов. Власти, хотя и осуждали подобный смотр "испорченных молодежных нравов", открыто возражать не решились — слишком уж неясным был витавший в те времена дух перестройки: неизвестно, что из него может получиться.

Лучше с тех пор, увы, жить мы не стали, не прибавилось в нашем государстве и демократии, в фон которой вполне естественно вписывался бы бунтарский, по существу, дух витебского фестиваля. Но, как это ни странно, фестиваль выжил. Да не просто выжил, а превратился к сегодняшнему дню в один из самых авторитетных на планете смотров современного танца, привлекающих к себе пристальное внимание крупнейших хореографов мира.

На одной из итоговых пресс-конференций с членами международной секции критики фестиваля известный в мире танца обозреватель литовского еженедельника "Lietuvos Rytas" Аудронис Имбрасас вполне серьезно отметил свое удивление тем обстоятельством, что такой фестиваль проводится на белорусской земле. После брифинга, когда мы попросили Аудрониса расшифровать свою мысль, тот улыбнулся: "Да просто уж очень не вяжется новаторство фестиваля с консерватизмом белорусской жизни вообще..."

Стоит отметить и еще одну особенность фестиваля. Хотя в учредителях его и значились официальные структуры вроде областного исполнительного комитета, власти не уделяли особого внимания происходившим в эти дни в культурно-деловом центре ОАО "Классика — индустрия моды" событиям. Как тут не вспомнить "официальный" фестиваль "Славянский базар", где совершенно привычными уже стали все первые и последующие лица самых высоких госструктур во главе с самим президентом. Впрочем, с другой стороны, современная хореография — это все-таки не Филипп Киркоров с Машей Распутиной.

Нет, власти особенно не расстарались для организации фестиваля хореографии, и в том, что это шоу состоялось, исключительно заслуга организаторов конкурса во главе с президентом фестиваля Мариной Романовской. Это благодаря их усилиям о витебском конкурсе танца знают во всех уголках планеты — от Токио до Нью-Йорка.

Но вернемся к хореографии. Интерес к X Витебскому фестивалю в среде причастных к современному танцу людей начал проявляться задолго до нынешних декабрьских дней. Необычайно большим, к примеру, "наплывом" заявочных видеокассет в адрес дирекции фестиваля. Достаточно сказать, что организаторы просмотрели 45 кассет, отобрав для участия в конкурсе лишь 27. Чрезвычайно широка география прошедших видеотур коллективов — от Петропавловска-Камчатского и Токио до Риги и Таллинна.

Разумеется, конкурс столь высокого уровня не мог обойтись без громких имен специалистов современной хореографии. Так и получилось — свое согласие на работу в жюри фестиваля дали такие мэтры танца, как американский педагог Серж Пейра, историк, критик и теоретик балета Японии Кенжи Усуи, создатель европейской школы джаз-танца Бенджамин Феликсдал из Голландии и другие известные специалисты. Достаточно авторитетной была и секция критики фестиваля, назовем лишь имена профессора, главного редактора московского журнала "Балет" Валерии Уральской, балетного критика Ларисы Барыкиной, главного редактора парижского издания "Les Seisons de la Dance" Филиппа Веррьеля.

"Не подвел" и витебский зритель, в очередной раз опровергший расхожее мнение о приоритете хлеба над зрелищами в наше время. У касс КДЦ обычной была табличка "Все билеты проданы", аншлаги на всех без исключения концертах радовали сердца исполнителей.

Нельзя не отметить и высочайший организационный уровень фестиваля. Об этом совершенно откровенно говорили и специалисты, имеющие возможность сравнивать, и сами участники конкурса, не чувствовавшие себя чужаками в белорусском городе.

Что же касается самой программы... Специалисты и критики еще оценят все нюансы исполнительского мастерства участников конкурса. Скажем лишь, что далеко не все коллективы сумели в полной мере проявить свои способности. Большего ожидали, например, от танцоров японской студии "Chizu Shoda Dance Fragment", днепропетровской школы "Другие танцы", таллиннского "Fine Five Dance Theatre". И наоборот, коллективы, отнюдь не блестяще прошедшие видеотур, добились очень хороших оценок.

Очень приятно отметить успех белорусских исполнителей. Два гродненских коллектива, модерн-балет "Галерея" и группа современного танца "ТАД", сумели выдержать острую конкуренцию и завоевали специальные призы секции критики, первый — "за творческий рост", и второй — "за эксперимент и фантазию".

Настоящей же сенсацией фестиваля стал молодой солист Пекинского хореографического института Лю Джан, сумевший покорить и членов жюри, и витебскую публику, завоевавший звание обладателя "Гран-при" и восторженные овации. Лауреатские звания увезли из Витебска челябинский ансамбль современного танца, екатеринбургский театр "Провинциальные танцы", театр танца "Аура" из Каунаса и московский дуэт Валерия Архипова.

Десятый, юбилейный, фестиваль современной хореографии в Витебске позади, но еще долго специалисты будут обсуждать достижения и промахи конкурсантов. Для нас же важно то, что у белорусского города Витебска появилось много новых друзей в различных уголках планеты, что гости фестиваля увезли с собой самые приятные впечатления от пребывания на белорусской земле.

Евгений ТОМОВ.

Мелочи жизни?

В магазине "Белскор" продают... "червивое" пиво

Григорий Васильевич Стебуля в тот вечер негодовал. Думал: после ванны бутылка пива с заманчивой наклейкой "Лидское" будет в самый раз. Предусмотрительно поставив ее на стол, не спешил открывать, потому что... вдруг заметил плавающих "насекомых".

Личинки червей в бутылке вывели Григория Васильевича из равновесия. Он мигом накинул пальто и направился в торговую точку заявлять о попрании своих прав потребителя. Там готовы были заменить злополучную бутылку и даже не на одну. Но принципиальный Григорий Васильевич взял наугад еще пять бутылок и в присутствии продавцов обнаружил червей еще в одной из них. Крыть торгашам было нечем.

Григорий Васильевич, у которого мгновенно отпало желание попить пивка, благополучно вернулся домой с закупоренным вещдоком. Вот и наседают теперь на него "заинтересованные лица". Остается только предупредить почитателей пива, чтобы не покупали его в магазине "Белскор", что по улице Карбышева в Зеленом Луге.

Виктор СВИРКО.

Сітуацыя

Рабочыя гідролізнага бадзяюцца без справы. Вымушана

Трэці тыдзень не працуе Бабруйскі гідролізны завод. Работнікі завода адпраўлены ў вымушаны адпачынак. Прычына неарыгінальная — няма збыту прадукцыі. Але камісія прэзідэнцкага кантролю, якая зараз працуе на заводзе, ніяк не паспрыяла сітуацыі. У выніку работнікі завода і дзяржава ў цэлым нясуць вялікія страты, бо чысты прыбытак працуючага завода за месяц складае 15 мільярдаў рублёў.

Аляксандра МАЗАЙ.

Погода

17 декабря днем, 18-го в течение суток по северо-востоку небольшой снег. Температура 17-го ночью -25...-30, местами до -32, днем -19...-24; по северу республики ночью -19...-24, днем -14...-19. 18 декабря ночью -11...-16, днем -6...-11; на северо-западе ночью -20...-25, днем -8...-13.

Рекламный отдел 229-29-04

Адкрыты ліст з эміграцыі да старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання С.Г.Шарэцкага

Сямён Георгіевіч, Вы сапраўды лічыце бел-чырвона-белы сцяг "фашысцкім"?

Шаноўны Сямён Георгіевіч!

Тэма гэтага ліста вымагае адкрытай размовы, і падаецца натуральным выкарыстаць старонкі "Народнай волі" — газеты, дзе гучыць голас прыхільнікаў розных партыйных падыходаў і ў якой Вы, як і ў шэрагу іншых, заклікалі да супрацьстаяння дыктатуры і вяртання да законнасці.

Хоць і са спазненнем, але да мяне трапіла копія Вашага звароту да суайчыннікаў, прымеркаванага да Дня прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Пад Вашымі словамі пра неабходнасць паважаць нацыянальную гісторыю падпішацца кожны, хто незалежна ад нацыянальнага паходжання лічыць сябе грамадзянінам Беларусі.

Так сталася, што ў той жа дзень знаёмы вашынгтонскі палітык перадаў мне ліст, які пасол Беларусі ў ЗША сп.В.Цапкала разаслаў амерыканскім сенатарам, кангрэсменам, грамадскім дзеячам. У ім сцвярджаецца, што Беларусь ідзе шляхам дэмакратычных і рынкавых рэформ, што канстытуцыйная законнасць з'яўляецца асновай палітыкі прэзідэнта Лукашэнкі, а ў галіне выканання правоў чалавека сярод астатніх дзяржаў... Беларусь ў першых шэрагах (менавіта так і заяўлена!). На шчасце, сваё меркаванне пра становішча ў нашай краіне амерыканскія палітыкі фарміруюць не толькі з інфармацыі прызначанага Лукашэнкам пасла.

Але што я заўважыў: і першы, і другі лісты аб'ядноўваў агульны малюнак, які ў абодвух выпадках быў змешчаны над тэкстам, — "лукашэнкаўскі" герб.

Сямён Георгіевіч, адкажыце шчыра: Вы сапраўды лічыце бел-чырвона-белы сцяг "фашысцкім", а "Пагоню" — "паліцэйскім" сімвалам? Перакананы, што не: у тым жа звароце Вы нагадваеце Вялікае княства Літоўскае, якое было наймагутнейшай краінай у Еўропе, Статут якога быў напісаны па-беларуску і ўпрыгожаны "Пагоняй". Вы гаворыце і пра абвяшчэнне Радай БНР 25 сакавіка 1918 года незалежнасці нашай дзяржавы, што, цытую Вашыя словы, "зрабіла ўплыў на развіццё нацыянальнай свядомасці". Дзяржаўнымі сімваламі Беларускай Народнай Рэспублікі былі, як вядома, бел-чырвона-белы сцяг і "Пагоня".

Такім чынам, Вас нельга папракнуць у няведанні найбольш прыкметных старонак гісторыі Беларусі. Але чаму ж тады Вы не выкарыстоўваеце нацыянальныя сімвалы?

Магчыма, самым істотным палітычным вынікам дзейнасці дэмакратычных дэпутатаў у Вярхоўным Савеце 12-га склікання было абвяшчэнне незалежнасці Беларусі і наданне нацыянальным сімвалам дзяржаўнага статусу. Ваш Вярхоўны Савет, кіруючыся толькі яму аднаму вядомай палітычнай выгодай (а можа, проста імкнучыся дагадзіць Лукашэнку), скасаваў тыя сімвалы ў першыя ж месяцы свайго існавання. Чым вярнулася Вам такая "выгода"?

А можа, Вярхоўны Савет прынцыпова не прымае бел-чырвона-белы сцяг ды "Пагоню"? У такім разе ўзнікае пытанне: вось цяпер пры парламенце створаны "ценявы кабінет", у якім, напэўна, ёсць пасада міністра ўнутраных спраў; у выпадку, калі "кабінет" пасля падзення рэжыму выйдзе з "ценю", гэты міністр аддасць загад міліцыі гэтак жа жорстка збіваць людзей за гістарычна-нацыянальныя сцягі і за мову, як гэта робіцца сёння?

Сямён Георгіевіч, скажыце шчыра: каб не масавыя акцыі на мінскіх вуліцах — сусвет лічыў бы, што легітымная частка парламенту не мае ніякай падтрымкі ў насельніцтва, і стаўленне да ўсіх вас было б зусім іншым. Але людзі — пераважна моладзь — выходзяць на мітынгі пад бел-чырвона-белымі сцягамі. Магчыма, калі б яны неслі не гэтыя ненавісныя рэжыму сімвалы, а тыя, якімі Вы аздабляеце дакументы легітымнага парламенту, — то не збівалі б іх дубінкамі, не кідалі б у міліцэйскія "варанкі", не прысуджалі б да зняволенняў ды штрафаў.

Нехта з Вашых паплечнікаў запярэчыць: "А якая розніца? Мы ж — супраць Лукашэнкі! І каб аб'яднаць паболей народу, у тым ліку і камуністаў (а БНФ нас усё роўна падтрымае), — мы выкарыстоўваем гэтую сімволіку. Вам што важней: гэтыя "цацкі" ці перамога над рэжымам? Вось пераможам Лукашэнку, тады ўсё вернем".

Тое ж самае чулася і на пачатку 1994 года ад каманды кандыдата ў прэзідэнты Лукашэнкі: "Вам якая розніца — мы ж таксама супраць Кебіча! Лукашэнка толькі для электарату кажа пра двухмоў'е і пра аднаўленне СССР, а як прыйдзе да ўлады — будзе і незалежнасць, і нацыянальная палітыка".

Пазіцыя "сёння палітычна выгадна адно, а заўтра іншае" — шкодная, асабліва калі прадметам гульні робяцца нацыянальныя каштоўнасці, роўна як і прынцыпы дэмакратыі, правоў чалавека, свабоды слова. Бо тыя, хто грэбаваў імі падчас выбарчай кампаніі, пасля дасягнення ўлады знішчаюць іх ушчэнт.

Вы шукаеце як мага шырэйшай падтрымкі сярод цяперашніх зацятых прыхільнікаў Лукашэнкі? Вы не здабудзеце яе, Сямён Георгіевіч, нават калі абгорнецеся чырвона-зялёным сцягам ды выйдзеце да прэзідэнцкай рэзідэнцыі з партрэтам Лукашэнкі ў адной руцэ і з выявай ягонага герба — у другой.

Вы і тыя Вашыя калегі па парламенце, якія засталіся верныя Канстытуцыі 1994 года, правялі сур'ёзную працу, каб сусветная супольнасць не прызнала вынікаў леташняга рэферэндуму.

Але рэферэндум 95-га года быў праведзены з неменшымі парушэннямі, пры гэткай жа схеме фальсіфікацыяў, што і леташні рэферэндум. Прычым той, першы, "плебісцыт" з самага пачатку быў замешаны на крымінале — збіцці дэпутатаў апазіцыі БНФ, якія спрабавалі прадухіліць нацыянальную ганьбу.

Выглядае дзіўным, што, заяўляючы пра нелегітымнасць леташняга рэферэндуму, які пазбавіў вас улады, вы, дэпутаты Вярхоўнага Савета 13-га склікання, маўчыце пра той, першы, рэферэндум. Між тым вынікі яго для нацыі — катастрафічныя. І калі ўжо сёння не зрабіць рашучых крокаў — яны стануць смяротнымі і, магчыма, незваротнымі. Беларуская нацыя знікне. Гэта адназначна, і якраз гэтага, я лічу, мэтанакіравана дамагаецца Лукашэнка і ягонае атачэнне. Прасоўваючы "новыя" сімвалы, яны імкнуліся зганьбіць беларусаў перад усім светам — і зганьбілі. Праглі спыніць працэс нацыянальнага адраджэння — і ў гэтым дасягнулі поспеху. Цяпер яны, як мне здаецца, ушчыльную падышлі да канчатковай мэты — ліквідацыі нацыі. І ў ход ідзе ўжо не толькі прапаганда, але і сіла.

Але ж Вы, Сямён Георгіевіч, Вашыя калегі па легітымным парламенце жадаеце нацыі іншай будучыні? І калі так, то лагічна выглядаюць наступныя дзеянні: на падставе парушэнняў Канстытуцыі і Закона аб рэферэндуме прызнаць рэферэндум 95-га года антызаконным і скасаваць ягоныя вынікі; прыняць пастанову аб аднаўленні ў якасці дзяржаўных бел-чырвона-белага сцяга і герба "Пагоня"; аднавіць у якасці адзінай дзяржаўнай мовы беларускую.

Істотным было б прыняцце парламенцкай рэзалюцыі пра дыскрымінацыю беларусаў па нацыянальнай прыкмеце. Пра гэта ў сваіх афіцыйных дакументах неаднаразова заяўляў БНФ. Пра гэта крыкам крычыць Таварыства беларускай мовы. Шматлікія факты такой дыскрымінацыі даводзіць да сусветнай супольнасці Беларускі Хельсінкскі камітэт. Але ацэнка гэтага працэсу, зробленая Вярхоўным Саветам, будзе мець прынцыповае значэнне, прымусіць міжнародныя арганізацыі і ўрады вядучых краінаў свету ставіцца да гэтай праблемы з максімальнай сур'ёзнасцю. Не будзем наіўнымі — наўрад ці міжнародная рэакцыя прымусіць рэжым імгненна адмовіцца ад сваёй палітыкі, але рэалізоўваць яе будзе значна цяжэй. А сёння ліквідацыя аднаго толькі Беларускага гуманітарнага ліцэя адкіне сістэму нацыянальнай адукацыі на дзесяцігоддзі.

Аднаўленне дзяржаўнага статусу нацыянальнай сімволікі, роўна як статусу беларускай мовы, — не той крок, які імгненна прынясе Вам папулярнасць. Але гэта вельмі істотны крок. Гэтак жа, як і цяпер, надзвычай важнымі выглядаюць вынікі працы, зробленай камісіяй Ганчара, па юрыдычнай ацэнцы злачынстваў рэжыму — у тым выпадку, натуральна, калі яны будуць зацверджаныя Вярхоўным Саветам, што, спадзяемся, адбудзецца.

Не думайце, паважаны Сямён Георгіевіч, што я імкнуся "прынізіць" ці "звузіць" ролю парламента, легітымнасць якога прызнае ўвесь цывілізаваны свет, заклікаючы замест палітыкі займацца "другаснымі" пытаннямі. У свой час нас, членаў парламенцкай апазіцыі БНФ, папракалі тым, што мы "толькі пра сцягі ды пра мову, а трэба больш пра эканоміку". Між тым 90 працэнтаў заканадаўчых прапаноў, падрыхтаваных апазіцыяй, тычыліся эканомікі і толькі астатнія — культуры і мовы. Сёння падаецца, што калі б прапорцыя была адваротная, то нацыя б была ў іншым стане. А значыць, не прагаласавала б за Лукашэнку ці падобнага да яго.

У гісторыі чалавецтва не было ніводнага выпадку, калі б народ, пазбаўлены нацыянальнай свядомасці, дасягнуў колькі-небудзь зайздроснага матэрыяльнага дабрабыту. І наадварот: не было яшчэ такога, каб супольнасць, якая адчувае сябе нацыяй, якая паважае свае святыні, не дамаглася заможнага жыцця. Прыклад першага — Беларусь. Прыклад другога — усе цывілізаваныя краіны.

Падзеі апошняга часу паказваюць, што Вярхоўны Савет у супрацьстаянні з рэжымам Лукашэнкі не ў стане скарыстаць нават даступныя яму парламенцкія метады. Магчымасцяў для адхілення яго ад пасады і перайманне ў яго ўлады парламенцкім шляхам у Вас застаецца ўсё меней.

А вось каб спыніць знішчэнне нацыі — дастаткова таго міжнароднага аўтарытэту, якім пакуль яшчэ валодае Вярхоўны Савет 13-га склікання. Нават самыя актыўныя высілкі палітычных партый, праваабаронцаў, інтэлегенцыі, прадстаўнікоў дыяспары не дадуць станоўчага выніку без заканадаўчых рашэнняў легітымнага парламенту. Гэты шанц усё яшчэ застаецца, і воляй лёсу ён выпаў менавіта Вам.

З павагай —

Сяргей НАВУМЧЫК,
намеснік старшыні Рады БНР.
г.Нью-Йорк.

Стоп-кадр

А вот и "скандальные" ряды крытого рынка минской "Комаровки"... Будет ли царить среди продавцов идеальный порядок и что считать таковым в нынешних условиях? На вопросы пусть теперь ищет ответы власть, превратившая эту зону свободной торговли в государственное предприятие. Многочисленные покупатели ищут здесь свой интерес — продукты ценой поменее и вкусом посмачнее.

На снимке: *шумят торговые ряды "Комаровки".*

Фото Геннадия СЕМЕНОВА, БелТА.

Чытач — газета

...А так хочацца адчуваць сябе ў сваёй краіне гаспадаром, а не чужынцам

Вялікае дзякуй за Вашу мужнасць, за праўду!

Дзякуючы "Народнай волі" ў нешта яшчэ верыцца: светлае і добрае.

Мы даўно ўжо не глядзім Беларускае тэлебачанне. Ад яго вее, як з труны. Расійскія сродкі масавай інфармацыі многа пра нас не распавядаюць. Радыё "Свабода" нехта глушыць. А так хочацца адчуваць сябе ў сваёй краіне гаспадаром, а не чужынцам.

Няхай Бог будзе Вашым заступнікам!

Сям'я НЕЎГЕНЁЎ.

Дзве пасадкі ў аварыйным рэжыме і абедзве ўдалыя

Мінулыя выхадныя былі вельмі напружанымі для дзяжурных наземных службаў Нацыянальнага аэрапорта "Мінск". 13 снежня ў 5 гадзін 05 мінут з борта ТУ-154, які падняўся ў паветра ў 4 гадзіны 15 мінут і накіроўваўся ў Пекін з пасадкай у Новасібірску, паступіла паведамленне аб тым, што адзін з рухавікоў выйшаў са строю. Экіпаж лайнера з 21 пасажырам на борце змог у экстрэмальнай сітуацыі зрабіць усё магчымае для безаварыйнай пасадкі ў родным аэрапорце. Ужо ў 6 гадзін 30 мінут самалёт быў на зямлі. Пацярпелых у гэтым перапыненым рэйсе не было.

14 снежня, але ўжо вечарам, здарылася амаль аналагічная сітуацыя. Самалёт ДС-8, які стартаваў з Мінска ў 21 гадзіну 44 мінуты і ўзяў курс на Перу, у 22 гадзіны 07 мінут падаў сігнал аб разгерметызацыі кабіны. На яго борце знаходзіліся 30-тонны груз і 17 чалавек экіпажа. Пасля вымушанага зліву гаручага ў паветры самалёт у 22 гадзіны 47 мінут вярнуўся ў Нацыянальны аэрапорт "Мінск". Прычыны гэтых тэхнічных непаладак высвятляюцца.

Таццяна СМІРНОВА.

Крымінал

Злачынцы вырашылі ўцяпліцца

У акцыянерным таварыстве "Факел" Шчучынскага раёна ўчынены адзін з самых буйных крадзяжоў на Гродзеншчыне. Трое злачынцаў праніклі на склад мясцовай зверагаспадаркі і ўкралі каля чатырох тысяч выробленых шкурак норкі на суму амаль сем мільярдаў рублёў.

Мяркуючы па дзеяннях злачынцаў, яны старанна рыхтаваліся да крадзяжу. З'явіўшыся на тэрыторыі зверагаспадаркі прыкладна ў дзве гадзіны ночы, зладзеі (у масках) звязалі вартавога, які знаходзіўся ў вагончыку, а потым дзяжурнага машыніста кампрэсарных установак. Пасля гэтага яны праніклі ў складскія памяшканні, забралі шкуркі, пагрузілі іх у мікрааўтобус і паехалі.

Не так даўно акцыянернае таварыства "Факел" ужо рабавалі, праўда, не ў такім маштабе. Тады супрацоўнікі міліцыі даволі хутка знайшлі злачынцаў. Як стала вядома карэспандэнту БелТА, супрацоўнікі праваахоўных органаў і цяпер выйшлі на след падазроных.

Трактары вернуты ўладальнікам

Літаральна лічаныя гадзіны спатрэбіліся аператыўнікам, каб знайсці і вярнуць калгасу імя Гагарына, што ў Воранаўскім раёне, выкрадзеныя з яго машыннага двара два трактары "Беларусь". А ўдалося гэта дзякуючы ўзаемадзеянню нашай міліцыі з літоўскай паліцыяй.

Як толькі з калгаса паступіла паведамленне аб крадзяжы, для пошуку злачынцаў былі сфарміраваны дзве спецгрупы — адна з міліцыянераў Воранаўскага РАУС, другая — з супрацоўнікаў абласнога УУС. Першая спецгрупа дзейнічала на тэрыторыі свайго раёна, другая, увайшоўшы ў кантакт з літоўскімі праваахоўнымі органамі, працавала ў суседняй рэспубліцы. Украдзеныя трактары ўдалося знайсці недалёка ад Вільнюса. Затрыманы таксама ўсе ўдзельнікі зладзейскай групы. Прычым пяцёра з іх арыштаваны на тэрыторыі Літвы.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-цэнтры УУС аблвыканкама, зладзеі падазраюцца і ў іншых крадзяжах, якія былі ўчынены на тэрыторыі раёнаў нашай рэспублікі, што мяжуюць з Літвой.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.

Служба "01" інфармуе

За мінулы тыдзень у рэспубліцы зарэгістравана 257 пажараў, у якіх загінула 20 чалавек.

Паводле інфармацыі, атрыманай у Галоўным упраўленні ваенізаванай пажарнай службы, агнём знішчана і пашкоджана 146 будынкаў, 11 адзінак тэхнікі, 114 тон грубых кармоў. Матэрыяльны ўрон склаў 1 мільярд 960 мільёнаў рублёў.

БелТА.

Скандал

"Комаровка" опять по-базарному подложила всем свинью

Людмила МАСЛЮКОВА, политический обозреватель "Народной воли".

Вслед за ноябрьским указом президента о реанимации партийно-советской практики реагирования власти на критические выступления государственных газет с неизбежностью должна была последовать акция какой-либо редакции по новому воплощению обветшавшей идеи. Конечно же, глубокий искренний энтузиазм обязана была проявить прежде всего президентская газета "Советская Белоруссия", что она и не замедлила сделать, предприняв "Акцию "СБ" "Мясо".

Два журналиста подложили свинью "Комаровке": то есть купили в деревне кабана и под видом крестьян прокрались на прилавки минского рынка с тайной целью по ходу продажи мяса выявить вопиющие недостатки в торговых рядах и около. Понятное дело, что ряженные "селянами" сразу же столкнулись с перекупщиком, а впоследствии убедились и в иных формах всесилия комаровской мафии. А ведь, казалось бы, менее года назад, ее бессмертию положил конец сам, как теперь выражается газета, "Глава нашего государства" (с большой буквы государственным журналистам велено писать этот титул совсем недавно). Александр Лукашенко со скандалом и помпой изгнал из храма торговли сельхозпродуктами "гнусных" свободных предпринимателей в феврале 1997 года. Но с тех пор темные дельцы, как оказалось, процветают на госпредприятии "Комаровский рынок" под руководством назначенного самим президентом директора.

Вот такую свинью подложили бессовестные торгаши своему любимому и заботливому Президенту с большой буквы!

Итак, государственные журналисты "вскрыли недостатки". "Советская Белоруссия" выдала рыночных дельцов с головой, напечатав, как сказали бы при Сталине, подробный донос на базарные безобразия в номере за 9 декабря "На "Комаровке" продать кабана можно, но сложно".

Власть немедленно и остро прореагировала: сам Александр Лукашенко показал пример, как следует исполнять его же собственное распоряжение о действенности печати. К "Президенту" и "Главе государства" немедленно был вызван председатель Комитета государственного контроля Республики Беларусь Н.Домашкевич. Ему велено было, образно говоря, "спустить шкуру" с вице-премьера В.Гаркуна, министра внутренних дел В.Агольца, новенького министра сельского хозяйства и продовольствия И.Шаколо, министра торговли П.Козлова, министра строительства и архитектуры В.Ветрова, председателя Белкоопсоюза В.Владыко, главного санитарного врача республики В.Филонова, минского мэра В.Ермошина, начальника столичной милиции Б.Тарлецкого и, разумеется, директора Комаровского рынка В.Романькова. В областные столицы, крупные города и райцентры понеслись грозные депеши о срочнейшей необходимости немедленно разобраться со всеми рынками страны.

Для господ министров в декабрьском морозном воздухе запахло паленой щетиной... Разнесся даже жуткий слух, что "Глава нашего государства" сгоряча собрался в воскресенье на базар, чтобы еще раз навести там полный и окончательный порядок.

Однако во всей этой чисто белорусской истории интересны две, действительно главные фигуры — настоящего крестьянина и обычного покупателя, которым злая судьбинушка что ни день подкладывает свинью.

При себестоимости килограмма свинины в живом весе в среднем по республике примерно 35 тысяч рублей государство закупает ее у честного производителя по красной цене 28 тысяч рублей. То есть "Президент" (поскольку он и есть государство) на каждом "кило" живого веса обирает сельчанина на несколько тысяч рубликов. Спасаясь от такой "опеки" и "заботы", крестьянин бежит к коммерсанту-перекупщику с той же "Комаровки".

